# Барока ў архітэктуры Беларусі

Выканаў: Акінча А.

# План

1. Агульная характарыстыка.
2. Абарончае будаўніцтва.
3. Прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі.
4. Культавае будаўніцтва.
5. Літаратура.

# 1. Агульная характарыстыка

- Стыль барока ў беларускай архітэктуры меў некалькі этапаў свайго развіцця.
- 1 этап – ранні – канец XVI – першая палова XVII ст. – характарызуецца пошукам формаў, стратай абаронных функцый; паступовым пераходам замкавага дойлідства ў палаца-замкавае. У культавым дойлідстве фарміруецца базілікальны тып храма з бязвежавым, а пазней з двухвежавым фасадам (касцёлы езуітаў у Гародні, дамініканцаў у Стоўбцах).

# Касцёл Святога Францыска Ксаверыя (Гродна)



# Касцёл Святога Казіміра ў Стоўбцах, узарваны ў 1958 г.



- 2 этап – сталы – другая палова XVII ст. – 1730-я гг.: стабілізацыя 2- вежавай базілікі, павелічэнне колькасці ярусаў вежаў, пластычная насычанасць фасадаў (Мікалаеўская царква ў Магілёве). Распаўсюджваецца палацава-сядзібнае будаўніцтва (комплексы ў Нясвіжы, Слоніме, Гародні, Воўчыне). Для іх характэрна П-падобная кампазіцыя з анфіладай, парадным дваром, багатым дэкорам і фасадаў і інтэ' ераў.
- 3 этап – позні – у культавай архітэктуры – "віленскае барока" (1730-я – 80-я гг.). Важную ролю ў развіцці гэтага адметнага для нашых зямель напрамку адыграла дзейнасць Я. К. Глаўбіца. Стыль вызначаецца пластычнасцю аб'ёмаў, маляўнічасцю сілуэта, стромкімі шмат'яруснымі ажурнымі вежамі, фігурнымі франтонамі, багаццем архітэктурнага дэкору (уніяцкі Сафійскі сабор у Полацку, Спаская царква ў Магілёве, ратуша ў Віцебску).

# Мікалаеўская царква ў Магілёве



# Сучасны выгляд Сафійскага сабору ў Полацку



# Спаская царква ў Магілёве, знялі ў 1938 – 1940 гг.



# Ратуша ў Віцебску



- Рысы барока выявіліся таксама ў праваслаўных і ўніяцкіх храмах (базыльянская царква і іканастас у Супраслі, комплекс у Жыровіцах, уніяцкія цэрквы ў Барунах і Княжыцах). Заходнееўрапейскія ўплывы тут сышліся з візантыйскімі і мясцовымі традыцыямі, што надало непаўторнасць асобным помнікам. Самабытна выглядае драўлянае культавае дойлідства на Беларусі.

- У перыяд з канца XVI – першай паловы XVII стст. культавая архітэктура з’явілася асноўнай базай для развіцця беларускага барока. З 1600 г. у Заходняй Еўропе пачаўся другі этап контррэфармацыі. Ад аскетычнай праграмы, выпрацаванай Трыдзенцкім саборам, каталіцызм перайшоў да масавага пераконвання народа мовай вобразаў і пачуццяў. На Беларусі новай хвалі контррэфармацыі супрацьстаяў пратэстантызм і яшчэ ў большай ступені праваслаўе, што стрымлівала рэалізацыю праграмы каталіцызму. Выпрацоўка новых сродкаў выразнасці манументальнай архітэктуры адбывалася ў атмасферы вострай рэлігійна-палітычнай барацьбы і саперніцтва ў культавым будаўніцтве, што спрыяла стварэнню самабытнай беларускай разнавіднасці барока.

- Станаўленне архітэктурнай разнавіднасці барока ў Беларусі на ранняй стадыі вызначалася інтэнсіўнымі пошукамі ў галіне аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі, выпрацоўкай спецыфічнага тыпу храма, які сінтэзаваў мастацкія прынцыпы новага стылю і традыцыі мясцовага дойлідства. На мяжы XVI і XVII стст. культавыя збудаванні яшчэ вызначаліся стылявой рознахарактарнасцю, перавагай форм таго ці іншага архітэктурнага стылю. Прыкладам такога спалучэння стыляў з’яўляецца касцёл у Камаях.

# Касцёл святога Яна Хрысціцеля ў Камаях



- Для культавых пабудоў італьянскага барока характэрны бязвежавы галоўны фасад, канцэнтраваліся асноўныя сродкі выразнасці. Такі фасад меў касцёл езуітаў у Нясвіжы. У першай чвэрці XVII ст. на Беларусі будуюцца шэраг трохнефавых базілік з бязвежавымі фасадамі, аднак у адрозненне ад нясвіжскага касцёла яны не мелі трансептаў. Найбольш ранні помнік гэтага тыпу ў беларускай архітэктуры – касцёл бернардзінцаў у Гродна (канец XVI – XVIII ст.). У яго архітэктуры адлюстраваліся некалькі перыядаў будавання храма. Будаўніцтва бязвежавых базілікальных храмаў працягвалася амаль да сярэдзіны і нават другой паловы XVIII ст.

# Касцёл езуітаў у Нясвіжы



# Касцёл бернардзінцаў у Гродна



- Аднак ужо ў другой чвэрці XVII ст. пашыраецца будаўніцтва храмаў з двухвежавым галоўным фасадам. Гэты тып становіцца найбольш характэрным для архітэктуры беларускага барока, а своеасаблівае вырашэнне галоўнага фасада з дзвюма вежамі па баках – адной з яго галоўных адметнасцей.

- У аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі абарончых храмаў баявыя вежы мелі самастойнае значэнне. Яны размяшчаліся па вуглах асноўнага аб’ёму і надавалі яму статычнасць, не вызначаючы пры гэтым кампазіцыю фасада, а толькі дапаўняючы яго. У архітэктурных помніках барока вежы з боку алтара зніклі, а на галоўным фасадзе захаваліся, бо падтрымлівалі ўласцівую новаму стылю дынаміку архітэктурных мас, пры якой вертыкалі веж з’яўляліся завяршальнымі элементамі. Яны акцэнтавалі ўвагу гледача на галоўным фасадзе. Паступова сфарміраваўся двухвежавы фасад як самастойны трохмерны аб’ём, які засланяе

- Манументальныя культавыя пабудовы на Беларусі звычайна размяшчаліся сярод нізкай драўлянай забудовы і ажыўлялі панараму гарадоў і мястэчак. Стварэнне маляўнічага сілуэта, выразнай аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі, дэталёвая апрацоўка ўсіх фасадаў – спецыфічныя рысы архітэктуры беларускага барока. Сілуэт барочных помнікаў фарміраваўся за кошт высокіх выцягнутых дахаў, нарастанне дынамікі кампазіцыі да завершанага вежамі галоўнага фасада.

- У культавай архітэктуры сталага барока (1650 – 1730 гг.) пераважала аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя двухвежавай базілікі і атрымалі далейшую распрацоўку яе асобныя элементы – вежы, франтоны, трансепты, а таксама пластычная распрацоўка фасадаў і інтэр’ераў. У культавых помніках сталага барока пры вялікай кампазіцыйнай ролі і дэкаратыўнасці галоўнага фасада захавалася тэктанічнае адзінства аб’ёмаў. Характэрнай рысай культавых збудаванняў гэтага часу з’яўляецца агульная для ўсіх аб’ёмаў цяга карніза, якая падзяляе фасад на масіўную ніжнюю частку і двухвежавае завяршэнне. У перыяд ранняга барока першае гарызантальнае чляненне фасадаў у трохнефавых базіліках знаходзілася на ўзроўні карніза бакавых нефаў, што зрокава рабіла іх больш прыземістымі, чым у аднанефавых храмах. Каб прыдаць ім большую дынамічнасць, у перыяд сталага барока ў трохнефавых базіліках вышыню ніжняга яруса бакавых вежаў сталі рабіць роўнай вышыні цэнтральнага нефа.

- Адна з асноўных рыс беларускага барока – манументальнасць, якая выявілася ў павелічэнні маштабу будынкаў адносна асяроддзя. Яна дасягалася пэўнай сістэмай прапорцый паміж асобнымі элементамі архітэктурнага арганізма. У помніках сталага беларускага барока суадносіны паміж бакамі асобных элементаў аб’ёмна-прасторавай структуры дасягалі 1:8, што разам з выцягнутымі, неадпаведнымі ордэрнаму модулю прапорцыямі дэкаратыўных дэталей надавала кампазіцыям асаблівую стройнасць і вертыкалізм. Пазней гэта тэндэнцыя атрымала развіццё ў стромкіх, амаль гатычных вежах віленскага барока. Унікальным архітэктурным помнікам, дзе знайшлі адлюстраванне важныя этапы развіцця мастацкіх прынцыпаў беларускага барока, з’яўляецца касцёл кармелітаў у Глыбокім, будаўніцтва якога завершана каля 1654 г.

# Касцёл кармелітаў у Глыбокім



- Будаўніцтва, якое вялося на Беларусі каталіцкімі ордэнамі, залежала непасрэдна ад Ватыкана. Магчыма, таму на фарміраванне стылістыкі позняга барока пэўны ўплыў зрабілі мастацкія ідэі архітэктараў Паўночнай Італіі, у першую чаргу Ф. Бараміні. Аднак яны былі творча перапрацаваны на глебе нацыянынльнай архітэктуры, што прывяло да стварэння своеасаблівай архітэктурна-мастацкай сістэмы – поздняга беларускага барока, якое ў мастацтвазнаўстве атрымала назву «віленскае». У стылі віленскага барока ўзводзіліся не толькі каталіцкія, але і уніяцкія, і праваслаўныя культавыя пабудовы.
- Віленскае барока − дынамічнае, лёгкае, свабоднае, у той час як сталае беларускае барока ў архітэктуры XVII ст. вызначалася стрыманасцю, масіўнасцю і глыбокай ўнутранай экспрэсіяй.

- Рысы “віленскага барока” найбольш яскрава выявіліся ў культавых пабудовах уніятаў, напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку (1738 — 60), цэрквы і манастыры базыльян у Беразвеччы (1756 — 79), Барунах (1747 — 57), Вольна (1768), Талачыне (1769 — 79), Богаяўленская і Крыжаўзвіжанская цэрквы ў Жыровічах (1769), Уваскрасенская царква ў Віцебску (1772) і інш. Для шэрага каталіцкіх храмаў гэтага перыяду характэрны больш груваздкія манументальныя формы, якія скláліся пад уплывам архітэктуры паўночна-італьянскага барока: касцёлы кармелітаў у Мядзелі (1739 — 54) і Магілёве (1739 — 52), мальтыйцаў у Сталовічах (1740 — 46), бернардзінцаў у Будславе (1767 — 83), езуітаў у Полацку (1745) і Лучаі. У меншай ступені ў каталіцкім будаўніцтве 2-й паловы 18 ст. знайшлі ўвасабленне мастацкія характарыстыкі віленскага барока: касцёлы ў Лужках, Слоніме, Германавічах, дамініканцаў у Смалянах і Дунілавічах.

# 2. Абарончае будаўніцтва

- Абарончае будаўніцтва ў XVII ст. па-ранейшаму захоўвае важнае месца. Работа на тэрыторыі некаторых галандскіх майстроў, напрыклад, Ван Лаера, Нонхарта, Ван Дадэна, Голанда, Валона, абумовіла значны ўплыў нідэрландскай рэнесанскай архітэктуры на замкавае будаўніцтва ў Рэчы Паспалітай. Звыклыя для іх прыёмы і сродкі, у прыватнасці выкарыстанне земляных валоў і рвоў, дазволілі сканцэнтраваць асноўную ўвагу на самі будынкі, часткова пазбавіўшы іх мастацкае вырашэнне суровых рысаў.
- Гальшанскі замак ўзведзены ў першай палове XVII ст. Па сваёй кампазіцыі нагадваў Мірскі замак: прамавугольны двор быў акружаны жылымі карпусамі і 6 вежамі, дзе акрамя жылля размяшчаліся і гаспадарчыя памяшканні. Сціплае аздабленне адрознівалася аднак ад падобных, але больш суровых пабудоў XIV — XVI ст.

# Рэканструкцыя пачатковага выгляду Гальшанскага замка



# Гальшанскі замак, сучасны выгляд



- Прыкладана ў той жа час паўстаў і Смалянскі замак (Белы Ковель), узведзенны ў нізкім, забалочаным месцы на высокім земляным насыпе, які атачаў роў. Унутраны прамавугольны двор утвораны трох- і чатырохпавярховымі карпусамі і шмат'яруснымі гранёнымі вежамі. Аздабленне падобна да комплексу ў Гальшанах і набліжае яго да палацавых пабудоў.
- Замак у Любчы таксама першай паловы XVII ст. размяшчаўся на ўзгорку каля Нёмана, квадратная ў плане пляцоўка, акружаная мураванымі сценамі, з трох бакоў атачаў штучны канал. Замак меў 4 вежы: тры чатырохгранныя, завершаныя шатрамі, і праязную вежу-браму. З боку ракі паміж дзвюма вежамі размяшчаўся палац. У формах кампазіцыі вежаў заўважны ўплыў драўлянага абарончага дойлідства, але сам замак ужо страціў манументальны выгляд крэпасцей.

# Замак Белы Ковель, Ю. Пешкі, кан. XVIII ст.



# Сучасны выгляд



# Любчанскі замак, Ю. Пешкі, кан. XVIII ст.



# Сучасны выгляд



# 3. Прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі

- Дом-крэпасць у Гайцюнішках узведзены ў 1613 г. з'яўляецца прыкладам арганічнага спалучэння жылёвых і абарончых функцыў у дадзены перыяд. Двухпавярховы будынак накрыты вальмавым дахам, чатыры вуглы фланкіруюць круглыя абарончыя вежы з шатровымі дахамі. Архітэктурнае вырашэнне будуецца на кантрасце асобных аб'ёмаў і вялікіх плоскасцей, звонку дэкор адсутнічае.

# Дом-крэпасць у Гайцюнішках.
# Н. Орда, 1877



# Сучасны выгляд



# Палац Бутрымовіча ў Пінску, помнік архітэктуры позняга барока (1784 – 90)



# 4. Культавае будаўніцтва

- Нягледзячы на сваю спецыфіку, культавае будаўніцтва ў гэты перыяд непасрэдна звязана з грамадзянскай архітэктурай, што праявілася ў будаўніцтве манастыроў, кляштароў і калегіумаў, для якіх яшчэ характэрны абарончыя рысы. Карпусы ўтваралі замкнёны ўнутраны двор, вакол якога групаваліся розныя па прызначэнню памяшканні: келлі, бібліятэка, класы, лабараторыі, трапезная, кухня, аптэка, шпіталь. З аднаго боку мог прымыкаць касцёл. Менавіта так быў вырашаны Нясвіжскі езуіцкі калегіум і касцёл Божага Цела пры ім — першае збудаванне на Беларусі ў стылі барока.
- Падобныя прынцыпы планіроўкі былі закладзены ў Пінскім (1631 — 1639 гг.) і Бабруйскім езуіцкіх калегіумах. Яны ж былі паўтораны ў гродзенскіх кляштарных комлексах бернардзінцаў, брыгітак і францысканцаў.

# Пінскі езуіцкі калегіум



# Касцёл Св. Мікалая ў Міры



- Запазычаныя з Італіі архітэктурныя формы яшчэ доўга спалучаліся ў мясцовым дойлідстве з элементамі готыкі і рэнесансу. Так у пачатку XVII ст. працягваецца будаўніцтва храмаў готыка-рэнесанснага тыпу, напрыклад, касцёл бернардзінцаў у Слоніме (1645 — 1671 гг.) або касцёл кармелітаў у Ружанах (1615 — 1617 гг.), які ўяўляе сабой аднанефную базіліку з ніжэйшай за асноўны аб'ём паўкруглай абсідай, а над уваходам узвышаецца чатырох'ярусная васьміграння вежа.
- У першай палове XVII ст., у перыяд ранняга барока, архітэктура фасадаў культавых будынкаў мела невялікі набор дэкаратыўных элементаў. У гэты час шмат будуецца бязвежавых трохнефных базілік, якія ў адрозненні ад нясвіжскага касцёла не маюць трансэпта: касцёл дамініканцаў у Мінску (1605 г.), францысканцаў у Гальшанах (1618 г.), дамініканцаў у Навагрудку (1617 — 1624 гг.), францысканцаў у Гродне (1635 г.), бернардзінцаў у Друі (1643 г.).

- Эпоха сталага і позняга барока, якая прыпадае на другую палову XVII — 80-я гг. XVIII ст., адзначаецца дзяленнем фасадаў, увядзеннем ляпніны, архітэктурныя дэталі становяцца лёгкімі і вытанчанымі, безвежавыя базілікі змяняюць дзвюхвежавыя, якія становяцца найбольш характэрнымі для беларускага барока. Вежы падтрымлівалі дынаміку мас, уласцівую для новага стылю і акцэнтуюць увагу гледачоў на галоўным фасадзе. Паступова дзвюхвежавы фасад-куліса, як самастойны трохвымерны аб'ём, засланіў сабой агульную кампазіцыю збудавання. Падобнае рашэнне бачна і ў архітэктуры брыгіцкага касцёл у Гродне (1642 – 1651 гг.), дзе паўкруглая апсіда зліваецца ў адзіны аб'ём з нефам. Фасад вырашаны ў выглядзе вузкага дзвюхвежавага аб'ёму з пяцічасткавым чляненнем, уласцівым для барочнай архітэктуры. Вежы маюць адзін ярус і не ўзвышаюцца над франтонам. Падобнае рашэнне маюць і касцёлы дамініканцаў у Стоўбцах (1612 – 1640), бернардзінак ў Мінску (1633 – 1642).

- Адным з культавых збудаванняў гэтага перыяду з'яўляецца, напрыклад, касцёл Св. Іосіфа пры калегіуме езуітаў у Віцебску (1716 г.). Шырока выкарыстоўваюцца ў сярэдзіне XVIII ст. дэкаратыўныя матывы ракако.

# Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі (Брыгіцкі касцёл) у Гродне



# Касцёл Св. Іосіфа і калегіум езуітаў, 1860-я гг.



# Касцёл Карла Барамеуша ў Пінску



- Барочныя храмы вельмі ўтульна ўпісаны ў нашу прыроду, навакольнае асяроддзе. І мы павінны зберагчы гэтую прыгажосць назаўсёды…

# 5. Літаратура


1. Адам Мальдзіс. «Шляхецкая культура XVII — першай паловы XVIII ст. Эпоха барока»
2. http://belarusianhistory.narod.ru/rpcult.html
3. http://referat911.ru/Arhitektura/arhitektura-kostjolov-belarusi/110993-1958291-place1.html
4. http://www.jivebelarus.net/culture/doilidstva.html
5. http://be.wikipedia.org/wiki/Архітэктура_Беларусі
6. http://ais.by/story/1609


ДЗЯКУЙ ЗА ЎВАГУ!